3. *Долгов, Ю. Г.* Охраняемый законом интерес в семейном праве / Ю. Г. Долгов // Право и политика. — 2003. — № 4. — С. 91—97.
4. Кодекс Республики Беларусь о браке и семье [Электронный ресурс] : прин. Палатой представителей 3 июня 1999 г. : одобр. Советом Респ. 24 июня 1999 г. : текст кодекса по состоянию на 10 янв. 2014 г. // Консультант Плюс: Беларусь. Технология 3000 / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2014.
5. *Першина, И. В.* Интерес в праве : дис. … канд. юрид. наук : 12.00.01 / И. В. Першина. — Н. Новгород : [б. и.], 2002. — 183 л.
6. *Малеина, М. Н.* Защита личных неимущественных прав советских граждан : пособие для слушателей нар. ун-тов / Н. М. Малеина. — М. : Знание, 1991. — 126 с.
7. Психология: комплексный подход : учеб. / М. Айзенк [и др.] ; под ред. М. Айзенка. — Минск : Новое знание, 2002. — 829 с.
8. *Грибанов, В. П.* Интерес в гражданском праве / В. П. Грибанов // Совет. государство и право. — 1967. — № 1. — С. 49—53.
9. *Малинова, А. Г.* Категория «интерес» в семейном праве : автореф. дис. … канд. юрид. наук : 12.00.03 / А. Г. Малинова ; Урал. гос. юрид. акад. — Екатеринбург : [б. и.], 2003. — 24 с.
10. *Маслоу, А. Г.* Мотивация и личность / А. Г. Маслоу. — 3-е изд. — СПб. : Питер, 2003. — 352 с.
11. *Беспалов, Ю.* Участие законных представителей в реализации семейных прав ребёнка / Ю. Беспалов // Рос. юстиция. — 2003. — № 6. — С. 32—33.
12. *Иоффе, О. С.* Избранные труды по гражданскому праву / О. С. Иоффе ; Моск. гос. ун-т. — М. : Статут, 2000. — 776 с.
13. *Худояров, Б. Т.* Защита прав и интересов детей по семейному праву Республики Таджикистан : дис. … канд. юрид. наук : 12.00.03 / Б. Т. Худояров. — Душанбе : [б. и.], 2000. — 191 с.
14. *Тагайназаров, Ш. Т.* Гражданско-правовое регулирование личных неимущественных прав граждан СССР / Ш. Т. Тагайназаров ; отв. ред. В. А. Ойзенгихт. — Душанбе : Дониш, 1990. — 213 с.
15. *Савельева Н. М.* Правовое положение ребёнка в Российской Федерации: гражданско-правовой и семейно-правовой аспекты : дис. … канд. юрид. наук : 12.00.03 / Н. М. Савельева. — Белгород : [б. и.], 2004. — 196 л.
16. Комментарий к Семейному кодексу Российской Федерации / отв. ред. И. М. Кузнецова. — М. : БЕК, 1996. — 512 с.

Материал поступил в редакцию 01.03.2014 г.

**УДК 343.431:343.343.6**

***С. А. Сілаеў***
Федэральная дзяржаўная бюджэтная ўстанова вышэйшай прафесійнай адукацыі «Кемераўскі дзяржаўны ўніверсітэт», г. Кемерава, Расійская Федэрацыя

## АБ СУАДНОСІНАХ ГАНДЛЮ ЛЮДЗЬМІ І АРГАНІЗАЦЫІ НЕЗАКОННАЙ МІГРАЦЫІ («КАНТРАБАНДЫ МІГРАНТАЎ»)

**Уводзіны.** Як вядома, арганізаваная злачыннасць — гэта «параўнальна масавае функцыянаванне ўстойлівых кіруемых супольнасцяў злачынцаў, што займаюцца ўчыненнем злачынстваў як промыслам (бізнесам) і ствараюць з дапамогай карупцыі сістэму абароны ад сацыяльнага кантролю»* (тут і далей у цытатах пераклад зроблены аўтарам артыкула. — ***С. С.***) [1, с. 19]. Арганізаваныя злачынныя фарміраванні могуць ажыццяўляць свой промысел у розных сферах. У апошні час асаблівую актуальнасць набываюць праблемы крымінальнай эксплуатацыі міграцыйных працэсаў. Гутарка тут ідзе перш за ўсё пра дзве цесна ўзаемазвязаныя, але не тоесныя з'явы: гандаль людзьмі (англ. *trafficking in persons* ці *trafficking in human beings*) і кантрабанда мігрантаў (*smuggling of migrants*). На жаль, некаторыя айчынныя спецыялісты не адрозніваюць гэтыя паняцці, ставячы паміж імі знак роўнасці [3, с. 76]. У пэўнай ступені гэта можна патлумачыць цяжкасцямі перакладу, якія, у сваю чаргу, абумоўлены плюралізмам тэрміналагічных традыцый: калі ў англамоўных краінах *trafficking in persons* азначае гандаль людзьмі, дык для Лацінскай Амерыкі *tráfico de personas* (таксама як для франкафонскага свету *trafic des personnes*) — гэта незаконны ўвоз мігрантаў, а гандаль людзьмі абазначаецца адпаведна тэрмінамі *trata de personas* і *traite des personnes* [4, с. 197]. Усё гэта лёгка ўбачыць пры супастаўленні тэкстаў двух пратаколаў да Канвенцыі ААН супраць транснацыянальнай арганізаванай злачыннасці на розных мовах. Так ці інакш, праз блытаніну гэтых двух паняццяў затушоўваецца спецыфіка, уласцівая кожнай з названых антысацыяльных з'яў як у плане фенаменалогіі, так і ў плане этыялогіі (дэтэрмінацыі), што, у сваю чаргу, адмоўна адбіваецца на ўсіх элементах процідзеяння вышэйзгаданым формам злачыннай дзейнасці: і на іх прафілактыцы, і на мінімізацыі вынікаў, і на барацьбе з імі, уключаючы праблемы крымінальна-прававой кваліфікацыі.

**Асноўная частка.** Для выяўлення сутнасных прыкмет гандлю людзьмі і кантрабанды мігрантаў, а таксама наступнага іх супастаўлення звернемся перш за ўсё да двух базавых міжнародных-прававых актаў у гэтай сферы — Пратакола аб прадухіленні і спыненні гандлю людзьмі, асабліва жанчынамі і дзецьмі, і пакаранні за яго (далей — Першы Палермскі пратакол) і Пратакола супраць незаконнага ўвозу мігрантаў па сушы, моры і паветры (далей — Другі Палермскі пратакол).

Паводле пункта «а» артыкула 3 Першага Палермскага пратакола, «гандаль людзьмі» азначае вярбоўку, перавозку, перадачу, хаванне ці атрыманне людзей у мэтах іх эксплуатацыі пры дапамозе пагрозы сілай ці яе прымянення або іншых форм прымусу, выкрадання, махлярства, падману, злоўжывання ўладай ці бездапаможнасцю становішча, або шляхам подкупа, у выглядзе плацяжоў ці выгады, каб дамагчыся згоды асобы, што кантралюе другую асобу. Пры гэтым асабліва агаворваецца, што эксплуатацыя ахоплівае, як мінімум, эксплуатацыю прастытуцыі другіх асоб ці іншыя формы

сексуальнай эксплуатацыі, прымусовую працу або паслугі, рабства і звычаі, падобныя да рабства, паднявольны стан і выманне органаў. Паводле ж пунктаў «а» і «б» артыкула 3 Другога Палермскага пратакола, пад кантрабандай людзей, якая ў афіцыйным тэксце дадзенага дакумента на рускай мове «далікатна» названа «незаконным увозам мігрантаў», маецца на ўвазе забеспячэнне, у мэтах атрымання непасрэдна або ўскосна нейкай фінансавай ці іншай матэрыяльнай выгады, незаконнага ўезда ў якую-небудзь дзяржаву-ўдзельніцу якой-небудзь асобы, якая не з'яўляецца яе грамадзянінам і не пражывае пастаянна на яе тэрыторыі. Пры гэтым «незаконны ўезд» азначае перасячэнне межаў без выканання неабходных патрабаванняў для законнага ўезда у дзяржаву.

З мэтай выканання ўзятых на сябе міжнародных-прававых абавязацельстваў Расійская Федэрацыя і Рэспубліка Беларусь імплементавалі адпаведныя палажэнні вышэйназваных пратаколаў у свае нацыянальныя крымінальныя кодэксы, прадугледзеўшы ў іх два склады злачынстваў, — гандаль людзьмі (артыкул 127[1] Крымінальнага кодэкса Расійскай Федэрацыі і артыкул 181 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь) і арганізацыю незаконнай міграцыі (артыкул 322[1] Крымінальнага кодэкса Расійскай Федэрацыі, артыкул 371[1] Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь). Пры гэтым расійскі і беларускі заканадаўцы ў пэўнай меры трансфармавалі канвенцыйныя азначэнні: у заканадаўчым апісанні гандлю людзьмі не пералічваюцца спосабы ўчынення дадзенага злачынства, але дабаўляюцца два дзеянні, якіх няма ў Першым Палермскім пратаколе, — купля-продаж чалавека і ўчыненне ў адносінах да яго іншых здзелак; у азначэнні арганізацыі незаконнай міграцыі, з аднаго боку, было знята паняцце карыслівых матываў, а з іншага — прадугледжана адказнасць за арганізацыю (а ў Беларусі яшчэ і за кіраўніцтва і садзейнічанне) не толькі незаконнага ўезду на нацыянальную тэрыторыю, але і незаконнага знаходжання на гэтай тэрыторыі, незаконнага транзіту праз яе і (у Рэспубліцы Беларусь) выезду з гэтай тэрыторыі. У наяўнасці, такім чынам, спроба расшырыць сферу прымянення крымінальна-прававых сродкаў процідзеяння аналізаваным з'явам у параўнанні з тым, як гэта прадугледжана ў Пратаколах.

Супастаўляючы канвенцыйныя і заканадаўчыя азначэнні гандлю людзьмі і арганізацыі незаконнай міграцыі (кантрабанды мігрантаў), расійскі крыміналіст Г. К. Смірноў звяртае ўвагу на два галоўныя адрозненні паміж імі. Па-першае, пры арганізацыі незаконнай міграцыі кантрабандысты не прымяняюць у адносінах да мігрантаў, якіх яны перавозяць, такіх захадаў, як падман, гвалт, прымус ці злоўжыванне даверам: асобы, што жадаюць незаконна міграваць у другую краіну, звычайна самі звяртаюцца да кантрабандыстаў, тады як пры гандлі людзьмі гандляры прымяняюць спецыяльныя захады па пошуках і прыцягненні патэнцыяльных ахвяраў. Па-другое, кантрабандысты маюць на мэце незаконны ўвоз іншаземцаў на нацыянальную тэрыторыю або перавозку іх праз краіну транзітам, пасля чаго стасункі паміж кантрабандыстамі і мігрантамі спыняюцца; гандляры ж людзьмі імкнуцца да эксплуатацыі чалавека, з-за чаго адносіны іх з пацярпелымі пасля перамяшчэння апошніх у месцы эксплуатацыі не спыняюцца, а пераходзяць у іншую стадыю [7, с. 39].

Часткова супадае пазіцыя па дадзеным пытанні ў сербскіх аўтараў Н. Тэафілавіча і Н. Радавіча, якія называюць наступныя крытэрыі для размежавання злачынстваў, што нас цікавяць: 1) галоўнай мэтай гандлю людзьмі з'яўляецца эксплуатацыя ахвяры, тады як кантрабанда мігрантаў — гэта па сутнасці саўдзельніцтва (дапамога) у незаконным уездзе мігрантаў у краіну, прычым, у адрозненне ад гандлю людзьмі, мігранты добраахвотна пагадзіліся на гэта; 2) асобы, якія жадаюць незаконна пранікнуць на тэрыторыю другой краіны, часцей за ўсё першымі выходзяць на кантакт з тымі, хто будзе іх перамяшчаць, тады як пры гандлі людзьмі арганізатары дадзенага злачынства самі рознымі спосабамі рэкрутуюць ахвяр; 3) гандаль людзьмі часцей за ўсё лічыцца злачынствам супраць асноўных правоў чалавека, а кантрабанда людзей — злачынствам супраць дзяржавы, бо гаворка ідзе аб парушэнні іміграцыйнага заканадаўства; 4) кантрабанда мігрантаў заўсёды змяшчае у сабе транснацыянальны элемент, тады як гандаль людзьмі можа ўчыняцца ў межах нацыянальнай тэрыторыі; нягледзячы на тое, што многія асобы, якія сталі прадметам кантрабанды, робяцца потым ахвярамі парушэнняў правоў чалавека, іх усё ж трэба лічыць не пацярпелымі (як у выпадку гандлю людзьмі), а злачынцамі, бо яны імкнуцца да сваёй выгады (менавіта гэтай акалічнасцю дадзеныя аўтары перш за ўсё тлумачаць той факт, што па заканадаўстве практычна ўсіх краін гандаль людзьмі караецца значна суровей, чым кантрабанда мігрантаў). Адпаведна, да ахвяр гандлю людзьмі трэба прымяняць захады дапамогі і абароны, а да тых, каго незаконна ўвезлі на тэрыторыю замежнай краіны, — арышт, крымінальнае пераследаванне і дэпартацыю [6, с. 391—393].

Як відаць, у абедзвюх разгледжаных намі крыніцах у якасці размежавальных крытэрыяў адзначаны як чыста юрыдычныя, так і крыміналагічныя і крыміналістычныя ўласцівасці злачынных дзеянняў. Паглядзім, наколькі гэтыя крытэрыі адэкватныя.

Перш за ўсё, дазволім сабе не пагадзіцца з апошнім з прапанаваных Н. Тэафілавічам і Н. Радавічам адрозненняў. Па-першае, прызнанне арганізацыі незаконнай міграцыі («кантрабанды мігрантаў») «безахвярным» злачынствам здаецца нам антыгуманным, бо пры гэтым ігнаруецца той відавочны факт, што большасць з тых, хто становіцца незаконнымі (ці, як лічаць за лепшае гаварыць еўрапейскія спецыялісты, «нерэгулярнымі») мігрантамі, жывуць ва ўмовах галечы, нізкага ўзроўню развіцця і адсутнасці роўных магчымасцяў, што і вымушае іх шукаць лепшай долі на чужыне. Гэтыя негатыўныя

сацыяльныя з’явы можна разглядаць як непасрэдныя дэтэрмінанты міграцыйных працэсаў, што выкарыстоўваюцца ў эгаістычных інтарэсах рознымі крымінальнымі элементамі, якія займаюцца як гандлем людзьмі, так і кантрабандай мігрантаў. Нагадаем, што ў айчыннай віктымалогіі ў залежнасці ад характару ўзаемадзеяння ахвяры і злачынцы адрозніваюцца «сітуацыі сутыкнення» і (не такія ўжо рэдкія) «сітуацыі супрацоўніцтва» [8, с. 750], так што адсутнасць канфлікту і накіраванасць дзеянняў на дасягненне аднаго і таго ж выніку яшчэ не сведчаць аб адсутнасці ахвяры, тым больш, што «супрацоўніцтва», па зразумелых прычынах, не з’яўляецца раўнапраўным і ў большай ступені выгадна злачынцу, а не ахвяры (у нашым выпадку — арганізатару незаконнай міграцыі, а не нелегальнаму мігранту). Па-другое, аўтары Другога Палермскага пратакола хоць і пазбягаюць ужывання тэрміна «ахвяра» у адносінах да незаконна перамешчаных асоб, але і не ставяць іх на адну дошку з арганізатарамі такога роду «кантрабанды». Так, артыкул 5 дадзенага дакумента выключае яго прымяненне да крымінальнага праследавання мігрантаў толькі за тое, што яны сталі аб’ектам забароненых у ім дзеянняў, а артыкул 16 прадугледжвае захады абароны і дапамогі, і, хаця гэтыя захады куды больш абмежаваныя за тыя, што могуць прымяняцца да ахвяр гандлю людзьмі (артыкул 6 Першага Палермскага пратакола), яны ўсё ж паважаюць і абараняюць шэраг фундаментальных правоў такіх асоб, уключаючы «абарону ад гвалту, які яны могуць зазнаць з боку асобных людзей або груп з прычыны таго, што яны сталі аб’ектам (гэтых) дзеянняў». Узяўшы пад увагу дадзеныя нормы Другога Палермскага пратакола, лічым, што, хаця фармальна дзеянні ахвяр кантрабанды мігрантаў ствараюць склад злачынства, прадугледжанага артыкул 322 Крымінальнага кодэксу Расійскай Федэрацыі (артыкул 371 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), прыцягненне іх да крымінальнай адказнасці па дадзеным артыкуле з’яўляецца непрымальным. Няма падстаў і для размовы аб дэпартацыі гэткіх нелегальных мігрантаў: у артыкуле 18 Другога Палермскага пратакола выкарыстоўваецца абцякальная фармуліроўка «вяртанне незаконна ўвезеных мігрантаў» (англ. *return of smuggled migrants*, ісп. *repatriación de los migrantes objeto de tráfico ilícito*), прычым такога роду «вяртанне» мусіць ажыццяўляцца «ўпарадкаваным чынам і пры належным уліку пытанняў забеспячэння бяспекі і павагі чалавечай годнасці гэтай асобы». Часам улады некаторых дзяржаў нават ідуць на тое, каб даць мігранту магчымасць застацца на іх тэрыторыі на законных падставах — і справа тут та не ў «абстрактным гуманізме», а ў прагматычным разліку на дачу «нерэгулярным» мігрантам паказанняў у якасці сведкі, якія б дапамаглі праваахоўным органам ліквідаваць адпаведны канал незаконнай міграцыі; інакш кажучы, размова ідзе аб своеасаблівым кампрамісе, аб «абмене інфармацыі на легалізацыю».

Транснацыянальны элемент сапраўды не з’яўляецца абавязковым для гандлю людзьмі, аднак ён і не выключаецца, а наадварот, становіцца даволі тыпічны для дадзенага віду злачыннай дзейнасці. Менавіта выпадкі транснацыянальнага гандлю людзьмі з’яўляюцца асабліва складанымі для крымінальна-прававой кваліфікацыі.

Вызначэнне розніцы ў аб’ектах таксама, у прынцыпе, правільна, аднак наўрад ці гэта можа дапамагчы правапрымяняльніку ў час расследавання або разгляду па сутнасці канкрэтнай крымінальнай справы, паколькі, па-першае, гэтая прыкмета дазваляе толькі зразумець заканадаўчыя матывы крыміналізацыі таго ці іншага дзеяння (т. зв. *ratio legis*), а па-другое, гандаль людзьмі — гэта шматаб’ектнае злачынства, прычым у выпадках, прадугледжаных пунктам «г» часткі другой артыкула $127^1$ Крымінальнага кодэкса Расійскай Федэрацыі (пункт 8 часткі другой артыкула 181 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), устаноўлены парадак кіравання ў сферы міграцыі выступае ў якасці абавязковага дадатковага аб’екта.

З пазіцый вучэння аб ценявой эканоміцы можна было б гаварыць аб тым, што пры гандлі людзьмі эканамічныя выгады атрымліваюцца шляхам прапанавання незаконнага тавару, якім з’яўляюцца людзі, — ахвяры дадзенага злачынства, тады як кантрабанда мігрантаў у сучасных умовах — хутчэй, прапанаванне законных паслуг па перасячэнні нацыянальных граніц у незаконнай форме. Гэта мае пэўнае значэнне для разумення этыялогіі і прафілактыкі дадзеных з’яваў, але не для іхняй крымінальна-прававой ацэнкі.

Такім чынам, адзіны больш-менш пэўны размежавальны крытэрый для гандлю паняццяў людзьмі і незаконнай міграцыі — гэта мэта эксплуатацыі. Што ж да розніцы ў тым, хто быў ініцыятарам устанаўлення злачынных сувязяў, якую адзначаюць і Г. К. Смірноў, і сербскія аўтары, дык яна мае хіба што доказнае (крыміналістычнае) значэнне, дазваляючы ў некаторых выпадках устанавіць гэтую самую эксплуататарскую мэту, прычым значэнне гэта не трэба ні недаацэньваць, не пераацэньваць. З аднаго боку, калі гандляры людзьмі выкарыстоўвалі гвалтоўныя метады вярбоўкі сваіх ахвяр, тады ў выпадку спынення іх дзейнасці на этапе перавозкі мэта эксплуатацыі можа быць устаноўлена праз паказанні пацярпелых. Аднак у выпадку, калі у ходзе вярбоўкі выкарыстоўваўся, напрыклад, падман, ахвяра можа да пары да часу ўспрымаць сваіх гандляроў як «дабрадзеяў», праз што эксплуататарская мэта аж да пачатку фактычнага яе дасягнення аказваецца такой, якую практычна немагчыма даказаць. Менавіта тут мы і падыходзім да ўяснення ўзаемасувязі паміж гандлем людзьмі і кантрабандай мігрантаў і самога сэнсу ўстанаўлення адказнасці за арганізацыю незаконнай міграцыі.

Апрача таго, што нелегальная міграцыя (і, адпаведна, яе арганізацыя) сама па сабе нясе немалую грамадскую небяспеку (пагаршае крыміагенную сітуацыю, стварае практычна некантралюемы рынак

тавараў і паслуг і такі ж некантралюемы адток грашовых сродкаў за мяжу, садзейнічае распаўсюджванню каранцінных інфекцый і іншых хваробаў, што рэгулюецца міжнароднымі правіламі, і ўзмацняе напружанасць у сферы міжнацыянальных і межканфесіянальных адносін) [2, с. 3—8], — яна яшчэ цесна звязана з гандлем людзьмі. З аднаго боку, нелегальны статус мігранта павышае яго віктымнасць: не знаходзячыся пад аховай афіцыйных улад краіны знаходжання, ён лёгка можа стаць ахвярай гандлю людзьмі і наступнай эксплуатацыі, у тым ліку з боку кантрабандыстаў, якія дапамаглі яму перасячы мяжу (напрыклад, калі ён не змог пакрыць ім расходы па перавозцы) [6, с. 392]. У гэтым выпадку арганізацыя незаконнай міграцыі і гандаль людзьмі знаходзяцца ў непасрэднай ці апасродкаванай прычынна-выніковай сувязі. З іншага боку, незаконнае перамяшчэнне мігрантаў праз дзяржаўную мяжу можа быць састаўной часткай (спосабам) транснацыянальнага гандлю людзьмі; у такіх выпадках норма аб арганізацыі незаконнай міграцыі аказваецца нібы «рэзервовай», дазваляючы прыцягваць вінаватых да крымінальнай адказнасці нават пры неўстанаўленні (недаказанасці) мэты эксплуатацыі як крымінальнай састаўной часткай прыкметы гандлю людзьмі. Калі ж такая мэта ўстаноўлена, то артыкул $127^1$ і $322^1$ Крымінальнага кодэкса Расійскай Федэрацыі (арт. 181 і $371^1$ Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь) знаходзяцца ў адносінах канкурэнцыі цэлага і часткі, якая вырашаецца згодна з агульным правілам, г.зн. на карысць нормы-цэлага. Беручы пад увагу ўсё вышэй адзначанае, можна сцвярджаць, што артыкул $322^1$ Крымінальнага кодэкса Расійскай Федэрацыі (артыкул $371^1$ Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь) з'яўляецца нормай з двайной прэвенцыяй, г. зн. ёю забяспечваецца крымінальна-прававая ахова і грамадскіх адносін у сферы міграцыі, і асобы чалавека, яе свабоды, гонару і годнасці пры спалучэнні выключна рэпрэсіўных элементаў з прафілактычнымі.

**Заключэнне.** На заканчэнне адзначым, што пэўную блытаніну ў вырашэнне пытання, узнятага ў дадзеным артыкуле, уносіць пункт «б» часткі трэцяй артыкула 6 Другога Палермскага пратакола, які замацоўвае ў якасці абцяжарваючай акалічнасці незаконнага ўвозу мігрантаў ягоную спалучанасць з бесчалавечным або зневажальным абыходжаннем з такімі мігрантамі, у тым ліку ў мэтах эксплуатацыі. Здаецца, што мы тут маем справу з відавочным дэфектам міжнароднай нарматворчасці, з яшчэ адным доказам таго, што «да напісання канвенцый, уключаючы тыя іх палажэнні, што абавязваюць дзяржавы прадугледзець адказнасць за пэўныя дзеянні, як правіла, падыходзяць зусім не з той уважлівасцю і сур'ёзнасцю, як таго патрабуе распрацоўка крымінальнага заканадаўства» [5, с. 26]. Паўторымся: незаконны ўвоз мігрантаў з мэтай іх наступнай эксплуатацыі — гэта гандаль людзьмі.

### Спіс цытаваных крыніц


1. *Гуров, А. И.* Организованная преступность — не миф, а реальность (социальные, правовые и криминологические аспекты борьбы с организованной преступностью) : пособие для слушателей нар. ун-тов / А. И. Гуров. — М. : Знание, 1992. — 80 с.
2. *Магеррамов, М. А.* Нелегальная миграция: понятие, общественная опасность, уголовно-правовое и криминологическое противодействие (по материалам России и Азербайджана) : автореф. дис. … канд. юрид. наук / М. А. Магеррамов ; Моск. гос. юрид. акад. — М. : [б. и.], 2008. — 26 с.
3. *Репецкая, А. Л.* Транснациональная организованная преступность : учеб. пособие / А. Л. Репецкая. — Иркутск : БГУЭП, 2005. — 215 с.
4. *Станојоска, А.* Процесот на создавање дефиниција на трговијата со луѓе / А. Станојоска // Годишникот на Факултетот за безбедност Скопје. — 2011. — С. 196—208.
5. *Стојановић, З.* Процес стварања кривичног законодавства и сузбијање криминалитета / З. Стојановић // Стање криминалитета у Србији и правна средства реаговања. Део III. — Београд: Правни факултет Универзитета, 2009. — С. 13—31.
6. *Теофиловиќ, Н.* Криумчарењето мигранти како закана по меѓународната безбедност / Н. Теофиловиќ, Н. Радовиќ // Безбедноста, еколошката безбедност и предизвиците на Република Македонија : зб. на трудови на науч-струч. конф. (Охрид, 17—18.09.2010). — Скопје : Факултет за безбедност, 2010. — С. 389—399.
7. Торговля людьми в Российской Федерации: квалификация, предупреждение, расследование : учеб.-практ. пособие / А. И. Дворкин [и др.]. — М. : Юристъ, 2007. — 294 с.
8. Частная криминология / отв. ред. Д. А. Шестаков. — СПб. : Юрид. центр Пресс, 2007. — 771 с.



Материал поступил в редакцию 27.02.2014 г.

УДК 347.945



***Ж. В. Хацук,*** кандидат юридических наук
Учреждение образования «Гродненский государственный университет им. Я. Купалы», Гродно


## ИНСТИТУТ КОНКУРЕНЦИИ ЮРИСДИКЦИИ

**Введение.** Реформирование судебной системы, и, в частности, разработка нового процессуального законодательства, требует глубокого изучения судебной практики. Среди проблем, с которыми сталкиваются судьи при рассмотрении дел в общих и экономических судах, необходимо выделить проблему взаимосвязи процессов как на национальном, так и на международном уровне.